# Справаздача Цэнтральнага Камітэта КП(б) Беларусі

*Даклад сакратара ЦК КП(б) Беларусі тав. ПАТОЛІЧАВА Н. С. на XX з'ездзе КП(б)Б 20 верасня 1952 г.**

---

Таварышы! З часу XIX з'езда Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі прайшло каля трох з паловінай гадоў. За гэты перыяд совецкі народ пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, пад мудрым вадзіцельствам вялікага правадыра і настаўніка таварыша Сталіна дабіўся новых выдатных поспехаў у будаўніцтве комунізма ў нашай краіне, ва ўмацаванні палітычнай, эканамічнай і ваеннай магутнасці Совецкай дзяржавы, ва ўмацаванні лагера міру, дэмакратыі і соцыялізма ва ўсім свеце.

Наша партыя пасля пабеданоснага сканчэння Вялікай Айчыннай вайны, апіраючыся на велізарныя перавагі совецкага грамадскага і дзяржаўнага ладу, палітычны і працоўны ўздым совецкага народа, разгарнула ў небывалых маштабах мірную будаўнічую работу. Таварыш Сталін у 1946 годзе вызначыў планы работы Комуністычнай партыі на бліжэйшае будучае і на больш працяглы перыяд, сфармуляваў асноўныя задачы чацвертага пяцігадовага плана. Перад совецкім народам была пастаўлена задача аднавіць пацярпеўшыя ў час вайны раёны краіны, аднавіць даваенны ўзровень прамысловасці і сельскай гаспадаркі і затым перавысіць гэты ўзровень у больш ці менш значных размерах.

У выніку самаадданай працы совецкіх людзей чацверты пяцігадовы план, пакладзены ў аснову ўсяго гаспадарчага і культурнага будаўніцтва ў нашай краіне ў пасляваенны перыяд, паспяхова выканан. Совецкая дзяржава ў небывала кароткія тэрміны пераадолела вынікі вайны і не толькі дасягнула даваеннага ўзроўню прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, але і значна перавысіла яго. Совецкі народ у пасляваенныя гады пяць разоў зніжаў рознічныя дзяржаўныя цэны на тавары шырокага спажывання. Гады пасляваеннага мірнага будаўніцтва ўвойдуць у гісторыю нашай Радзімы як адна з найярчэйшых старонак самаадданай барацьбы совецкага народа за перамогу комунізма.

У барацьбе за пабудову комуністычнага грамадства ў СССР развіваюцца і мацнеюць маральна-палітычнае адзінства совецкага грамадства, брацкае супрацоўніцтва і дружба народаў, совецкі патрыятызм, інтэрнацыянальны дух совецкага народа. Згуртаваныя ленінска-сталінскай дружбай народаў, усе нашы рэспублікі дабіліся за пасляваенныя гады велізарных палітычных, гаспадарчых і культурных поспехаў.

Вялікіх поспехаў дабіўся і беларускі народ. Дзякуючы велізарнай дапамозе партыі, урада, асабіста таварыша Сталіна, Беларуская ССР за гады чацвертай пяцігодкі аднавіла разбураную вайной народную гаспадарку. Растуць і развіваюцца прамысловасць, сельская гаспадарка, культура і мастацтва Совецкай Беларусі.

Паспяховае выкананне чацвертага пяцігадовага плана дазваляе прыняць новы пяцігадовы план. XIX з'езд ВКП(б) разгледзіць і зацвердзіць дырэктывы па новаму пяцігадоваму плану, які забяспечвае далейшы

---

* Друкуецца па скарочанай стэнаграме.

ўздым усіх галін народнай гаспадаркі, рост матэрыяльнага дабрабыту, аховы здароўя і культурнага ўзроўню народа. Апублікаваны ў друку праект дырэктыў XIX з'езда партыі па пятаму пяцігадоваму плану развіцця СССР на 1951 — 1955 гады выклікаў новую хвалю палітычнага і працоўнага ўздыму совецкага народа.

Комуністычная партыя натхніла і арганізавала совецкіх людзей на барацьбу за новыя перамогі комуністычнага будаўніцтва, за ажыццяўленне грандыёзнага сталінскага плана пераўтварэння прыроды. Будаўніцтва гіганцкіх гідраэлектрастанцый, каналаў і арашальных сістэм увянчалася першым вялікім поспехам. Совецкі народ з найвялікшай радасцю нядаўна адзначаў пуск Волга-Данского суднаходнага канала імені В. І. Леніна. У новым пяцігоддзі будзе ўведзена ў дзеянне найвялікшая ў свеце Куйбышэўская гідраэлектрастанцыя. Будаўніцтва такіх гіганцкіх збудаванняў у нашай краіне па сваіх маштабах, тэхнічнаму замыслу і ўзроўню пераўышае ўсё, што калі-небудзь ведала гісторыя прамысловага будаўніцтва. Такое будаўніцтва даступна толькі нашай совецкай соцыялістычнай дзяржаве. Яно знамянуе сабой новы этап у развіцці прадукцыйных сіл нашай Радзімы, у стварэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы комунізма.

На працягу ўсёй сваёй гісторыі Комуністычная партыя і яе вялікія правадыры Ленін і Сталін заўсёды надавалі і надаюць рашаючае значэнне прапагандзе марксізма-ленінізма, ідэалагічнай рабоце, выхаванню кіруючых кадраў, усіх комуністаў у духу ленінізма, комуністычнаму выхаванню працоўных, пераадоленню перажыткаў капіталізма ў свядомасці людзей. Апошнія гады характэрны далейшым рашучым уздымам ідэалагічнай работы ў нашай краіне. Завяршэнне чацвертага выдання Твораў В. І. Леніна і выданне трынаццаці тамоў Твораў І. В. Сталіна з'яўляецца выдатнай падзеяй у ідэйным жыцці нашай партыі і ўсяго совецкага народа. Велізарнае значэнне ў далейшым развіцці тэорыі марксізма-ленінізма, ва ўздыме навукі і культуры краіны на вышэйшую ступень мае геніяльная праца таварыша Сталіна «Марксізм і пытанні мовазнаўства».

Таварыш Сталін узброіў нашы кадры магутнай ідэйнай зброяй у барацьбе за комунізм, даў асноваапалагаючыя ўказанні па карэнных пытаннях развіцця нашай навукі і натхніў дзеячоў совецкай навукі і культуры на барацьбу за іх далейшае развіццё, супроць вульгарызатарства і апашлення марксісцкай тэорыі, супроць дагматызма і начотніцтва. Праведзеныя пад кіраўніцтвам ЦК ВКП(б) дыскусіі па грамадскіх і прыродазнаўчых навуках, выкрыццё нізкапаклонства перад растленнай буржуазнай «культурай», касмапалітызма і іншых праяўленняў варожай совецкаму народу буржуазнай ідэалогіі яшчэ вышэй узнялі баявы патрыятычны дух работнікаў совецкай навукі і культуры. Нашы вучоныя паспяхова ажыццяўляюць гістарычнае ўказанне таварыша Сталіна аб тым, каб не толькі дагнаць, але і перавысіць у бліжэйшы час дасягненні навукі за межамі нашай краіны. Наша навука займае передавое месца ў свеце.

Ажыццяўляючы сталінскае вучэнне аб падборы, расстаноўцы і выхаванні кадраў, Комуністычная партыя вырасціла і загартавала на практычнай рабоце шматлікія кадры — рашаючую сілу партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва. Партыя выхоўвае кадры ў духу высокай адказнасці за даручаную справу, у духу патрабавальнасці да сябе і другіх, смелай крытыкі недахопаў. Крытыка і самакрытыка, вучыць таварыш Сталін, з'яўляецца законам нашага развіцця, рашаючым сродкам пераадолення ўсякай руціны і коснасці, усяго старога, адміраючага, што перашкаджае нашаму пабеданоснаму руху ўперад.

Сусветна-гістарычныя перамогі Совецкага Саюза, мудрая сталінская

знешняя палітыка, палітыка барацьбы СССР за мір і супрацоўніцтва паміж народамі аказваюць велізарны ўплыў на развіццё міжнароднага жыцця і забяспечваюць нашай краіне падтрыманне соцень мільёнаў людзей ва ўсіх краінах. СССР — несакрушальны аплот дэмакратыі і соцыялізма, цэнтр прыцягнення ўсіх прагрэсіўных сіл чалавецтва, якія імкнуцца абвуздаць амерыкана-англійскіх імперыялістычных падпальшчыкаў новай вайны, умацаваць мір ва ўсім свеце.

У выніку другой сусветнай вайны, у рэзультаце перамогі Савецкага Саюза над германскім фашызмам і японскім імперыялізмам, у радзе краін Еўропы ўстанавіўся народна-дэмакратычны лад, які ажыццяўляе функцыі дыктатуры пролетарыята і забяспечвае няўхільны рух гэтых краін да соцыялізма. Паваротным пунктам у гісторыі Еўропы з'явілася ўтварэнне Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Перамога вялікага кітайскага народа, які скінуў імперыялістычны гнёт і стварыў Кітайскую Народную Рэспубліку, адкрыла новую старонку ў гісторыі не толькі кітайскага народа, але і ўсіх прыгнечаных народаў Азіі, нанесла новы мацнейшы ўдар па ўсёй сістэме сусветнага імперыялізма.

Разглядаючы перспектывы барацьбы, якая разгарнулася паміж сіламі прагрэсу і сіламі рэакцыі, В. І. Ленін яшчэ ў 1923 годзе пісаў: «Зыход барацьбы залежыць, у канчатковым выніку, ад таго, што Расія, Індыя, Кітай і т. п. складаюць гіганцкую большасць насельніцтва. А іменна гэтая большасць насельніцтва і ўцягваецца з незвычайнай хуткасцю за апошнія гады ў барацьбу за сваё вызваленне, так што ў гэтым сэнсе не можа быць ні ценю сумнення ў тым, якое будзе канчатковае вырашэнне сусветнай барацьбы. У гэтым сэнсе канчатковая перамога соцыялізма ў поўнай меры і безумоўна забяспечана».

Гэтыя мудрыя словы заснавальніка большэвіцкай партыі і Савецкай дзяржавы В. І. Леніна бліскуча пацвярджаюцца ўсім ходам гістарычнага развіцця.

Таварышы! У праекце дырэктыў XIX з'езда ВКП(б) па пятаму пяцігадоваму плану развіцця СССР на 1951 — 1955 гады ўказваецца:

«Гэты (пяты) пяцігадовы план зноў дэманструе перад усім светам вялікую жыццёвую сілу соцыялізма, карэнныя перавагі соцыялістычнай сістэмы гаспадаркі перад капіталістычнай сістэмай. Гэты пяцігадовы план з'яўляецца планам мірнага гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Ён будзе садзейнічаць далейшаму ўмацаванню і расшырэнню эканамічнага супрацоўніцтва Савецкага Саюза і краін народнай дэмакратыі і развіццю эканамічных зносін з усімі краінамі, якія жадаюць развіваць гандаль на пачатках раўнапраўя і ўзаемнай выгады.

Мірнае развіццё савецкай эканомікі, намячаемае пяцігадовым планам, процістаіць эканоміцы капіталістычных краін, якія ідуць па шляху мілітарызацыі народнай гаспадаркі, атрымання найвышэйшых прыбыткаў для капіталістаў і далейшага збяднення працоўных».

Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, пад вадзіцельствам таварыша Сталіна працоўныя СССР, актыўна спаборнічаючы за паспяховае выкананне народнагаспадарчых планаў, узводзяць велічны будынак камунізма.

Сваімі сусветна-гістарычнымі перамогамі ў будаўніцтве камунізма савецкі народ абавязан Камуністычнай партыі, мудраму правадыру партыі і народа таварышу Сталіну! **(Бурныя, працяглыя апладысменты).**

Камуністычная партыя з'яўляецца кіруючай і накіроўваючай сілай савецкага народа, яе палітыка складае жыццёвую аснову савецкага ладу.

У Комуністычнай партыі совецкі народ бачыць свайго выпрабаванага кіраўніка, розум, чэсць і сумленне нашай эпохі.

Комуністычная партыя прыходзіць да свайго XIX з'езда адзінай, цесна згуртаванай вакол свайго Цэнтральнага Камітэта, вакол вялікага правадыра і настаўніка ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва — таварыша Сталіна. **(Бурныя, працяглыя апладысменты).**

«Цяпер галоўныя задачы Комуністычнай партыі Совецкага Саюза, — гаворыцца ў праекце тэксту змененага Статута партыі, — заключаюцца ў тым, каб пабудаваць комуністычнае грамадства шляхам паступовага пераходу ад соцыялізма да комунізма, няспынна павышаць матэрыяльны і культурны ўзровень грамадства, выхоўваць членаў грамадства ў духу інтэрнацыяналізма і ўстанаўлення брацкіх сувязей з працоўнымі ўсіх краін, усямерна ўмацоўваць актыўную абарону Совецкай Радзімы ад агрэсіўных дзеянняў яе ворагаў».

Таварышы! Усю сваю дзейнасць за справаздачны перыяд ЦК КП(б) Беларусі і партыйныя арганізацыі рэспублікі накіроўвалі на вырашэнне задач, выстаўляемых Комуністычнай партыяй, на выкананне дырэктыў ЦК ВКП(б), Саюзнага ўрада, указанняў таварыша Сталіна.

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі — адзін з баявых атрадаў вялікай партыі Леніна — Сталіна — прышла да свайго XX з'езда яшчэ больш загартаванай, боездольнай, як ніколі адзінай, да канца адданай вялікаму ленінскаму сцягу, згуртаванай вакол Цэнтральнага Камітэта Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў), вакол нашага вялікага правадыра і настаўніка таварыша Сталіна. **(Працяглыя апладысменты).**

Гэтая справаздача аб рабоце Цэнтральнага Камітэта паміж XIX і XX з'ездамі КП(б)Б ахапляе больш чым трохгадовы перыяд дзейнасці Компартыі. Як працаваў Цэнтральны Камітэт і ўся Комуністычная партыя Беларусі, як вырашаліся ў Совецкай Беларусі задачы, выстаўляемыя Партыяй і Саюзным урадам за прайшоўшыя гады, якія вынікі гаспадарчага і культурнага будаўніцтва?

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## I.

## РАЗВІЦЦЁ ПРАМЫСЛОВАСЦІ, ТРАНСПАРТУ І БУДАЎНІЦТВА

Таварышы! Прамысловасць рэспублікі за прайшоўшыя гады развівалася хуткімі тэмпамі, якія значна перавышаюць даваенныя. Гэта — адна з характэрных рыс пасляваеннага развіцця прамысловасці Беларусі. Калі к пачатку 1946 года аднаўленне і развіццё прамысловасці ў рэспубліцы знаходзілася на ўзроўні, прыкладна, 1928 года (такая была ступень разбурэння прамысловасці ў час вайны), то, у выніку паспяховага выканання першага пасляваеннага (чацвертага) пяцігадовага плана, у 1950 годзе даваенны ўзровень вытворчасці быў перавышан на 15,1 процанта. Такім чынам, задача, пастаўленая чацвертым пяцігадовым планам развіцця народнай гаспадаркі па аднаўленню разбуранай у час вайны прамысловасці Беларусі, была паспяхова выканана. Аб'ём вытворчасці за пяцігоддзе ўзрос у 5,7 раза, а сярэднегадавыя тэмпы прыросту склалі 41,7 проц.

Другой характэрнай рысай развіцця прамысловасці рэспублікі з'яўляецца тое, што яна развіваецца на больш высокай тэхнічнай аснове. У Беларусі пабудавана і будуецца значная колькасць новых прадпрыемстваў, аснашчоных высокай сучаснай тэхнікай вытворчасці, укараняецца больш перадавая тэхналогія з улікам накопленага вопыту прадпрыем-

ствамі краіны. Асабліва вялікім дасягненнем у развіцці прамысловасці Беларусі з'яўляецца стварэнне такіх перадавых галін прамысловасці, як аўтамабілебудаванне, трактарабудаванне, станкабудаванне, прадпрыемстваў па выпуску матацыклаў, веласіпедаў і г. д. Такім чынам, мы маем цяпер у Беларусі больш перадавую ў тэхнічных адносінах прамысловасць, чым да вайны. Гэтая прамысловасць створана таксама ў выніку паспяховага выканання чацвертага пяцігадовага плана.

Далей неабходна ўказаць яшчэ на адну асаблівасць у развіцці прамысловасці Беларусі. Пры высокім тэмпе развіцця ўсіх галін прамысловасці, якія склаліся ў Беларусі яшчэ ў даваенныя гады, асабліва хутка развіваліся машынабудаванне і станкабудаванне. Тэмпы развіцця машынабудавання і станкабудавання значна перавышаюць тэмпы росту астатніх галін прамысловасці. Дастаткова сказаць, што машынабудаўнічыя прадпрыемствы саюзнага падпарадкавання ў 1951 годзе выпусцілі прадукцыі ў 14,7 раза больш, чым у 1940 годзе. Хуткі рост машынабудавання і станкабудавання, бясспрэчна, з'яўляецца вялікім дасягненнем у індустрыялізацыі і ў развіцці ўсёй народнай гаспадаркі рэспублікі.

* * *

Для забеспячэння прамысловага развіцця рэспублікі ЦК КП(б)Б, у адпаведнасці з законам аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі, удзяляў вялікую ўвагу развіццю энергетыкі, паліўнай прамысловасці і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў. Далейшыя перспектывы развіцця ўсёй прамысловасці і ў цэлым народнай гаспадаркі рэспублікі ў значнай ступені залежаць ад стану гэтых галін прамысловасці.

**Энергетыка.** Да Айчыннай вайны Беларусь не мела дастатковых энергетычных магутнасцей, якія забяспечвалі-б хуткі рост прамысловасці, а існуючыя электрастанцыі былі пераважна дробнымі і не звязанымі паміж сабой у больш ці менш буйныя энергавузлы. Пасля Айчыннай вайны прароблена вялікая работа па ўмацаванню энергетычнай базы: адноўлены і расшыраны раней існаваўшыя станцыі, пабудаваны новыя. У выніку гэтага энергетычныя магутнасці ў сучасны момант перавышаюць даваенныя амаль у 2,5 раза.

Аднак праведзеную работу па будаўніцтву электрастанцый нельга лічыць дастатковай. Компартыя павінна паклапаціцца аб далейшым росце энергетычных магутнасцей, праявіць у гэтай справе належную настойлівасць.

Неабходна вырашыць задачу кальцавання электрычных магутнасцей з тым, каб больш поўна іх выкарыстаць. У нас пакуль нават такія больш ці менш буйныя энергасістэмы, як Мінская і Віцебская, дзейнічаюць раздзельна, хоць Мінская энергасістэма магла-б у сучасны момант аказаць істотную дапамогу такім прамысловым цэнтрам, як Віцебск, Магілеў, Орша. Асобна існуюць Гомельская, Бабруйская сістэмы і іншыя. Усё гэта сведчыць аб сур'ёзным адставанні развіцця энергетычнай базы рэспублікі, аб нізкім узроўні яе тэхнічнага стану і эксплуатацыі.

Інтарэсы далейшай індустрыялізацыі Беларусі патрабуюць таго, каб умацаванне і развіццё энергетычнай базы было пастаўлена ў цэнтр увагі партыйнай арганізацыі і, у першую чаргу, ЦК, абкомаў і гаркомаў партыі з тым, каб энергетыка ў нас развівалася з апярэджаннем у адносінах да іншых галін народнай гаспадаркі. Апрача стварэння новых магутнасцей і кальцавання сістэм, нам неабходна рашуча ўзняць на больш высокую ступень усю справу энергазабеспячэння народнай гаспадаркі. Нават у горадзе Мінску, дзе, безумоўна, ёсць лішак магутнасцей, дапускаюцца зрывы работы асобных прадпрыемстваў з-за аварый на электра-

станцыях. Гэта ў аднолькавай ступені адносіцца і да сістэмы Беларусэнерга і да сістэмы Галоўэнергаўпраўлення, да іх кадраў і асабліва кіраўнікоў сістэм тт. Батвініка і Бразгоўкі, якія нясуць прамую адказнасць, за гэтыя непарадкі. Усе гэтыя недахопы трэба рашуча ліквідаваць.

Так абстаіць справа з адным з карэнных пытанняў развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі — энергетыкай.

**Паліва.** Асноўным відам паліва ў Беларусі, як вядома, з'яўляецца торф, запасы якога велізарныя. ЦК КП(б)Б удзяліў вялікую ўвагу развіццю паліўнай прамысловасці. Праводзіцца немалая работа па расшырэнню існуючых прадпрыемстваў, будаўніцтву новых, па механізацыі і павелічэнню здабычы торфу. У цяперашні час торфу ў рэспубліцы здабываецца на 25,4 процанта больш, чым да вайны. Значна расшыраецца вытворчасць торфабрыкетаў.

Аднак трэба адзначыць, што прароблеThe работа з'яўляецца недастатковай, у выніку чаго ў забеспячэнні народнай гаспадаркі палівам ёсць цяжкасці. Тлумачыцца гэта тым, што цэлы рад кіраўнікоў міністэрстваў і прадпрыемстваў усё яшчэ бесклапотна адносіцца да гэтага важнага пытання, прабуе ўхіліцца ад яго або вырашыць яго шляхам завозу вугалю, не лічачыся з дальнасцю перавозак.

У далейшай рабоце па ўмацаванню паліўнай базы нам неабходна дабіцца значнага павелічэння здабычы торфу. Трэба павялічыць капіталаўкладанні ў распрацоўку новых тарфяных масіваў, уцягнуць у гэтую справу ўсіх спажыўцоў, — я маю на ўвазе прадпрыемствы саюзных і саюзна-рэспубліканскіх міністэрстваў, — поўнасцю выкарыстаць тэхніку і далей весці справу механізацыі працэсаў здабычы торфу. Неабходна выкарыстаць торф для атрымання газу з мэтай задавальнення бытавых патрэб насельніцтва і прамысловых прадпрыемстваў горада Мінска.

**Будматэрыялы.** Развіццё прамысловасці будаўнічых матэрыялаў у рэспубліцы таксама мае першаступеннае значэнне. ЦК КП(б) Беларусі пасля XIX з'езда прыняў у гэтым напрамку рад мер, і вытворчасць будаўнічых матэрыялаў за гэтыя гады значна расшырылася. Дастаткова сказаць, што выпуск цэглы павялічыўся за гэты час на 366 мільёнаў штук і ў 1952 годзе перавышае даваенны ўзровень у 2,2 раза. Арганізавана вытворчасць шыферу, будаўнічага гіпсу, сухой тынкоўкі, пачата вытворчасць керамічных блокаў, шкляных труб і інш.

Але трэба адзначыць, што Міністэрства прамысловасці будаўнічых матэрыялаў рэспублікі і яго прадпрыемствы дапускаюць вельмі сур'ёзныя недахопы і памылкі ў сваёй рабоце, і ўсё гэта прамым чынам адбіваецца на тэмпах і якасці будаўніцтва. Самы буйны недахоп, я сказаў-бы, парок, які меў месца ў міністэрстве да апошняга часу, гэта боязнь новага. Уся работа Міністэрства прамысловасці будаўнічых матэрыялаў была сканцэнтравана выключна на вырабе цэглы. Аднак якасць цэглы да гэтага часу нізкая, за што Міністэрства прамысловасці будаўнічых матэрыялаў ужо многа разоў падвяргалася рэзкай крытыцы.

Усю справу вытворчасці будаўнічых матэрыялаў у рэспубліцы трэба ўзнімаць на новую ступень, якая адпавядала-б патрэбнасцям шырокага прамысловага і культурна-бытавога будаўніцтва. Згодна ўказання ўрада ў нас у 1952 годзе разгортваецца вытворчасць раду новых відаў будаўнічых матэрыялаў, прадугледжваецца будаўніцтва новых буйных заводаў: жалезабетонных і карбанізаваных вырабаў, арматурных дэталей, сілікатнай цэглы і пенасілікатных вырабаў, абліцовачных пліт, кафельных вырабаў і інш. Такім чынам, прамысловасць будаўнічых матэрыялаў рэспублікі атрымае значнае развіццё.

Далейшае развіццё атрымалі **лясная, папяровая і дрэваперапрацоўчая**

**прамысловасць,** якія сваю прадукцыю пастаўляюць не толькі народнай гаспадарцы Беларусі, але і вугальнай прамысловасці краіны, вялікім будоўлям комунізма, будаўніцтву высотных будынкаў у Маскве і іншым спажыўцам.

Лясная прамысловасць, у якой пераважала ручная праца і сезонная рабочая сіла, ператварылася ў развітую механізаваную прамысловасць з пастаяннымі кваліфікаванымі кадрамі рабочых. Аб'ём механізаванай нарыхтоўкі лесу ў параўнанні з 1948 годам узрос у 7,5 раза, а ўзровень механізаванай вывазкі лесу дасягае 70 проц. агульнага аб'ёму.

Праведзеная работа па расшырэнню і рэканструкцыі прадпрыемстваў папяровай і дрэваперапрацоўчай прамысловасці дазволіла павялічыць выраб паперы ў 2,3 раза, фанеры — у 2,6 раза і запалак — у 2,4 раза ў параўнанні з 1948 годам.

На аснове далейшай механізацыі вытворчых працэсаў і палепшання арганізацыі працы неабходна дабіцца, каб лясная прамысловасць працавала больш устойліва, на працягу ўсяго года своечасова выконвала планы, давала высокаякасную прадукцыю. Дрэваперапрацоўчая прамысловасць павінна развівацца ў напрамку павелічэння паглыбленай перапрацоўкі драўніны, расшырэння асартыменту і палепшання якасці прадукцыі.

* * *

Чыгуначны і водны транспарт БССР за апошнія гады значна тэхнічна аснасціўся і з года ў год перавыконвае план грузаабароту. Значна зніжан сабекошт перавозак. Разам з тым трэба сказаць, што транспартныя арганізацыі да гэтага часу па-сапраўднаму не выкарыстоўваюць велізарныя ўнутраныя рэзервы для далейшага палепшання сваёй работы. На большасці аддзяленняў чыгунак не выконваецца план абароту вагонаў, графік руху паяздоў, пародавая пагрузка і іншыя якасныя вымяральнікі. Колькасць аварый і браку прадаўжае заставацца яшчэ вялікай.

Чыгуначны і водны транспарт Беларусі з'яўляецца магутным фактарам далейшага хуткага развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі. У сувязі з гэтым важнейшая задача партыйных арганізацый — больш удзяляць увагі рабоце чыгунак, аддзяленняў, вузлоў, прыстаней, аказваць пастаянную дапамогу палітаддзелам, пярвічным партарганізацыям і прадпрыемствам транспарту.

* * *

Дзякуючы велізарнай дапамозе партыі і Савецкага ўрада ў Беларусі на працягу ўсяго пяцігоддзя вяліся вялікія **будаўніча-аднаўленчыя работы.** Яшчэ большы размах яны атрымалі ў 1951 — 1952 гадах. За справаздачны перыяд толькі па лініі фінансавання прамысловага і комунальнага банкаў асвоена капіталаўкладанняў каля 4,5 мільярда рублёў. Будаўнічыя арганізацыі рэспублікі, створаныя пасля Айчыннай вайны, сур'ёзна выраслі, набылі вялікі вопыт у будаўніцтве, у значнай ступені механізавалі працаёмкія работы, шырэй пачалі прымяняць перадавыя высокапрадукцыйныя метады працы. За справаздачны перыяд у эксплуатацыю зданы сотні тысяч квадратных метраў вытворчых і больш аднаго мільёна квадратных метраў жылых плошчаў. Шырокім фронтам вядуцца будаўнічыя работы ў Віцебску, Магілеве, Гомелі, Бабруйску і іншых гарадах.

ЦК КП(б) Беларусі асабліва важнае значэнне надаваў і цяпер надае прамысловаму і культурна-бытавому будаўніцтву ў сталіцы рэспублікі.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

у Мінску будуюцца прамысловыя прадпрыемствы, жылыя дамы, школы, вышэйшыя навучальныя ўстановы і інш. За справаздачны перыяд у Мінску пабудавана 348 тысяч квадратных метраў жылой плошчы. Многае робіцца па добраўпарадкаванню горада. Можна не сумнявацца, што Мінск — сталіца Беларусі ў бліжэйшыя гады стане сапраўды буйным прамысловым і культурным цэнтрам у краіне, прыгожым і добраўпарадкаваным горадам. З дапамогай нашай партыі, Саюзнага ўрада і асабіста таварыша Сталіна, пры актыўным удзеле ўсяго беларускага народа гэтая задача будзе ажыццёўлена.

Што датычыць іншых гарадоў рэспублікі, то ЦК КП(б)Б прыняў ужо і далей прыме рад мер па ўзмацненню ў іх прамысловага і культурна-бытавога будаўніцтва.

Але неабходна адзначыць, што ў рабоце будаўнічых арганізацый усё яшчэ ёсць многа недахопаў. Рад арганізацый адпускаемыя дзяржавай сродкі поўнасцю не асвойвае. Слабасць многіх нашых будаўнічых арганізацый з'яўляецца сур'ёзным тормазам у далейшым расшырэнні будаўніцтва. Неабходна прыняць дадатковыя меры па ўмацаванню гэтых арганізацый. Тое, што кіруючыя органы Беларусі стварылі буйныя мясцовыя будаўнічыя арганізацыі — гэта зроблена прадбачліва і з разлікам. Але разам з тым неабходна, каб цэлы рад саюзных і саюзна-рэспубліканскіх міністэрстваў таксама меў у Беларусі больш буйныя будаўнічыя арганізацыі.

Далей, неабходна, каб будаўнікі ўдасканальвалі сваю работу ў адпаведнасці з патрабаваннямі як прамысловага, так і культурна-бытавога будаўніцтва. Між тым, многія кіраўнікі не ўдзяляюць неабходнай увагі высокай якасці работ і ў першую чаргу ў жыллёвым і культурна-бытавым будаўніцтве. Прычым, калі гутарка ідзе аб земляных работах, фундаментах, кладцы сцен — справы больш ці менш ідуць паспяхова, але як толькі даходзіць да аддзелкі, — тут і замінкі. Вось прыклад. За першае паўгоддзе 1952 года план капіталаўкладанняў на жыллёвае будаўніцтва асвоен на 103 процанты, тады як план уводу жылых плошчаў за паўгоддзе выканан толькі на 20 процантаў. Асабліва трэба звярнуць увагу на якасць унутранай аддзелкі жылых дамоў. Нам здаецца, што кіраўнікі асноўных будаўнічых арганізацый—тт. Рыжыкаў, Каменскі, Жыжаль, Сапракоў і іншыя павінны зрабіць для сябе з гэтага адпаведныя вывады.

Патрабуецца прыняць дадатковыя меры па палепшанню дзейнасці праектных арганізацый.

Умацаванне будаўнічых арганізацый, палепшанне якасці будаўнічых работ — адна з важнейшых задач Кампартыі.

Таварышы! ЦК у сваім кіраўніцтве развіццём прамысловасці на першы план ставіў задачу далейшага ўздыму энергетыкі, паліўнай прамысловасці, вытворчасці будаўнічых матэрыялаў і ўмацавання будаўнічых арганізацый, палепшання работы лясной прамысловасці, чыгуначнага і воднага транспарту. Гэтыя галіны гаспадаркі з'яўляюцца базай для паспяховага развіцця ўсёй народнай гаспадаркі.

Праект дырэктыў па пятаму пяцігадоваму плану развіцця СССР прадугледжвае далейшае развіццё гэтых галін народнай гаспадаркі. Кампартыя (большэвікоў) Беларусі прыме ўсе меры для паспяховага вырашэння гэтай задачы.

* * *

Вышэй ужо было сказана, што рост машынабудаўнічай і станкабудаўнічай прамысловасці ў рэспубліцы ў пасляваенныя гады ішоў вельмі хутка. За апошнія тры з палавінай гады пасля XIX з'езда КП(б)Б капі-

талаўкладанні ў машынабудаўнічыя прадпрыемствы саюзнага падпарадкавання склалі сотні мільёнаў рублёў.

Машынабудаўнічыя заводы за апошнія гады многае зрабілі ў асваенні новых відаў прадукцыі. Аўтамабільны завод асвоіў вытворчасць 25-тонных самазвалаў і 7-тонных грузавых аўтамабіляў; трактарны завод—дызельматораў, пускавых матораў, трактараў «КД-35», тралёвачных трактараў «КТ-12»; мотавелазавод — матацыклаў; станкабудаўнічыя заводы Мінска, Віцебска і Гомеля асвоілі вытворчасць складаных спецыялізаваных і унікальных станкоў; «Гомсельмаш» — ільнатрапальных, кудзелепрыгатавальных, зернеачышчальных машын, сіласных камбайнаў; рад заводаў арганізаваў выпуск машын для меліярацыі і дарожнага будаўніцтва.

Далейшыя перспектывы развіцця машынабудаўнічай і станкабудаўнічай прамысловасці ў рэспубліцы велізарныя. Нам неабходна рашуча палепшыць кіраўніцтва гэтай галіной прамысловасці. У першую чаргу трэба дабіцца поўнага выкарыстання вытворчых магутнасцей і першакласнай тэхнікі на трактарным, аўтамабільным і іншых заводах, а таксама забяспечыць устойлівае выкананне прадпрыемствамі дзяржаўных планаў. Партыйныя арганізацыі абавязаны з усёй адказнасцю заняцца ліквідацыяй цэлага раду недахопаў, якія перашкаджаюць паспяховай рабоце заводаў. Трэба мабілізаваць калектывы рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў на паспяховае выкананне заданняў партыі і ўрада, умацаваць працоўную дысцыпліну на прадпрыемствах, арганізаваць як належыць справу абучэння кадраў, выхавання маладых рабочых. Неабходна палепшыць падбор і расстаноўку гаспадарча-адміністратыўных і інжынерна-тэхнічных кадраў з тым, каб гэтыя кадры адпавядалі свайму прызначэнню, маглі-б выкарыстаць перадавую тэхніку гэтых прадпрыемстваў і рухаць яе ўперад, укараняць перадавую тэхналогію вытворчасці, найбольш перадавую арганізацыю працы.

У сучасны момант справа развіцця машынабудавання і станкабудавання ў нас пастаўлена такім чынам, што ўсе прадпрыемствы гэтых галін бесперапынна расшыраюцца і ўдасканальваюцца. Компартыя большэвікоў Беларусі будзе і ў далейшым удзяляць вялікую ўвагу і рухаць уперад гэтую важнейшую галіну прамысловасці.

* * *

Хутка развіваюцца ў Беларусі **лёгкая, харчовая, мяса-малочная, мясцевая і кааператыўная** прамысловасць.

За прайшоўшыя пасля XIX з'езда гады ў рэспубліцы значна ўзрасла вытворчасць абутку, швейных, каўровых, панчошна-трыкатажных вырабаў, вытворчасць масла, сыроў, малочных кансерваў, мясапрадуктаў, кандытарскіх вырабаў і вырабаў табачнай прамысловасці. У новым пяцігоддзі ўсе гэтыя галіны прамысловасці ў рэспубліцы атрымаюць далейшае развіццё. Пачата будаўніцтва ў Мінску буйнага меланжавага камбіната. Будуць расшырацца існуючыя ільнапрадпрыемствы, у прыватнасці Аршанскі ільнакамбінат. Расшырацца прадпрыемствы каўровай і абутковай прамысловасці. Намячаецца будаўніцтва ільнакамбіната ў Полацку.

Растуць кансервавая, макаронная галіны харчовай прамысловасці. Будуць будавацца новыя хлебазаводы і гароднінасушыльныя заводы. У мяса-малочнай прамысловасці намячаецца будаўніцтва буйнага мясакамбіната, масласыраробчых, малочных і іншых заводаў.

* * *

Таварышы! У прамысловасці БССР адбываецца працэс сур'ёзнага тэхнічнага ўздыму, асвойваюцца новыя складаныя віды прадукцыі, расце тэхніка. У гэтых умовах паспяхова кіраваць прамысловасцю змогуць толькі тыя кадры, якія будуць глыбока вывучаць і ведаць эканоміку і тэхніку вытворчасці. Таму трэба дабівацца ад гаспадарчых, інжынерна-тэхнічных і партыйных работнікаў сістэматычнага павышэння сваіх эканамічных і тэхнічных ведаў.

Неабходна таксама праяўляць няспынныя клопаты аб стварэнні пастаянных высокакваліфікаваных кадраў рабочых прамысловасці, аб росце інжынерна-тэхнічных работнікаў. Партыйныя арганізацыі абавязаны добра ведаць кіруючыя кадры прамысловасці, уважліва вывучаць іх дзелавыя і палітычныя якасці, правільна расстаўляць іх, дапамагаць ім у практычнай рабоце, своечасова і смела вылучаць маладых работнікаў.

За справаздачны перыяд прамысловасць і транспарт рэспублікі, калі браць іх абагуленыя паказчыкі, у цэлым паспяхова спраўляліся з выкананнем гадавых дзяржаўных планаў. У 1949 годзе прамысловасцю дзяржаўны план быў выканан на 102 працэнты, у 1950 годзе — на 101,5 працэнта, у 1951 годзе — 103,1 працэнта, за 8 месяцаў 1952 года — на 104 працэнты.

Важнейшай умовай паспяховага выканання дзяржаўных планаў, няспыннага росту прадукцыйнасці працы, зніжэння сабекошту і павышэння якасці выпускаемай прадукцыі з'яўляецца выпрабаваны нашай партыяй метад сацыялістычнага спаборніцтва. У сучасны момант сацыялістычным спаборніцтвам ахоплена 94,9 працэнта ўсіх працуючых у прамысловасці рэспублікі. Велізарным мабілізуючым фактарам разгортвання сацыялістычнага спаборніцтва за выкананне вытворчых планаў з'явіліся абавязацельствы, якія ўзялі на сябе калектывы прамысловых прадпрыемстваў, будоўляў, чыгуначнага транспарту ў пісьме вялікаму правадыру і настаўніку таварышу Сталіну. У ходзе сацыялістычнага спаборніцтва на прадпрыемствах рэспублікі нараджаліся і нараджаюцца новыя формы і метады барацьбы за паспяховае выкананне планаў, за эканомію сыравіны, паліва, матэрыялаў, за павышэнне якасці і зніжэнне сабекошту прадукцыі.

У нас выраслі тысячы наватараў вытворчасці. Усёй рэспубліцы вядомы імёны наватараў — дыспетчара Мінскага аддзялення чыгункі тав. Суднікава, токара Мінскага трактарнага завода тав. Арэхоўскага, лесаруба-стаханаўца тав. Гудзіліна, каменшчыкаў тт. Булахава, Дудко, тынкоўшчыка тав. Нікалаева, стаханаўкі мінскай фабрыкі «Комунарка» тав. Астраух і другіх. Высокіх паказчыкаў у рабоце дасягаюць не толькі асобныя рабочыя, але і цэлыя калектывы прадпрыемстваў.

Аднак у сацыялістычным спаборніцтве яшчэ не зжыты сур'ёзныя недахопы. Сацыялістычнае спаборніцтва на радзе прадпрыемстваў накіравана, галоўным чынам, на дасягненне колькасных вынікаў, няма барацьбы за высокія якасныя паказчыкі. Кіраўніцтва ім з боку партыйных, прафсаюзных арганізацый часта мае павярхоўны, фармальны характар, дрэнна абагульняюцца і пашыраюцца перадавыя метады працы.

Кіраўнікі многіх галін прамысловасці рэспублікі — міністры, начальнікі главкаў недыферэнцыравана ажыццяўляюць кіраўніцтва падведамственнымі прадпрыемствамі, задавальняюцца сярэднімі лічбамі выканання плана ў цэлым па сістэме, не праяўляюць належнай настойлівасці ў барацьбе за выкананне плана кожным прадпрыемствам.

Так, напрыклад, план першага паўгоддзя 1952 года прадпрыемствы Міністэрства лёгкай прамысловасці выканалі ў цэлым на 102,6 працэнта. Аднак 28 працэнтаў прадпрыемстваў Міністэрства не выканалі паўгадавога плана. Яны недадалі прадукцыі на 7,2 мільёна рублёў. Па Міністэрству харчовай прамысловасці, пры выкананні плана за паўгода на 106,7 працэнта 33,9 працэнта прадпрыемстваў не выканалі сваіх вытворчых планаў і недадалі народнай гаспадарцы прадукцыі на 32 мільёны рублёў. Такая практыка прыкрывання і замазвання дрэннай работы адных прадпрыемстваў за кошт добрай работы другіх не мае нічога агульнага з совецкім метадам кіраўніцтва гаспадаркай.

Сур'ёзныя недахопы маюць месца ў выкананні прамысловымі прадпрыемствамі планавых заданняў ва ўстаноўленым асартыменце і якасці выпускаемай прадукцыі. Рад прадпрыемстваў міністэрстваў лёгкай, мясцовай, харчовай прамысловасці, промкааперацыі дапускае антыдзяржаўную практыку перавыканання планаў вытворчасці па валавой прадукцыі за кошт другарадных вырабаў пры невыкананні заданняў па вытворчасці важнейшых відаў прадукцыі ўстаноўленай якасці і асартыменту. Рэспубліка на працягу доўгага часу падвяргаецца вострай крытыцы за дрэнную якасць абутку, выпускаемага нашымі прадпрыемствамі. Але Міністэрства лёгкай прамысловасці і міністр тав. Сацункевіч праяўляюць бездапаможнасць у ліквідацыі гэтага сур'ёзнага недахопу.

Барацьба за палепшанне якасці прадукцыі мае важнейшае гаспадарча-палітычнае значэнне. Партыйныя арганізацыі павінны ўзначаліць гэтую барацьбу і ўцягнуць у яе ўсіх рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў, шырока выкарыстаць вопыт перадавікоў вытворчасці, строга караць віноўнікаў выпуску нядобраякаснай прадукцыі.

Важнейшым паказчыкам, які характарызуе якасць работы ўсёй прамысловасці, з'яўляецца сабекошт прадукцыі. Між тым барацьба за зніжэнне сабекошту і павышэнне рэнтабельнасці работы прадпрыемстваў, за ўмацаванне гаспадарчага разліку, за найстражэйшы рэжым эканоміі сродкаў, матэрыялаў і працы ў прамысловасці яшчэ не стала асновай вытворчай дзейнасці многіх гаспадарчых і інжынерна-тэхнічных работнікаў прадпрыемстваў і не знаходзіць належнага адлюстравання ў дзейнасці партыйных і совецкіх арганізацый.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы